

Мазырскія Навіны

Гавары - і цябе пачуюць

студзень, 2014

ГРАМАДСКАЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ВЫДАННЕ

ВЫБАРЫ Ў МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ. Хроніка падзей

Мазыр: раённая камісія створана з чыноўнікаў, начальнікаў і дэпутатаў

Мазырская раённая выбарчая камісія створана па прынцыпу «усе – свае людзі». Калі глянуць няўзброеным вокам на спіс камісіі – дык ніякіх там начальнікаў ці чыноўнікаў няма, спрэс прадстаўнікі «ад грамадзян», «прафсаюзу», грамадскіх аб'яднанняў. Калі ж разабрацца – дык адны начальнікі, працаўнікі выканкаму ды нават і два дэпутаты раённага Савету! Так, у склад раённай камісіі ўвайшоў дэпутат райсавету Сяргей Каробкін (змяніў шмат прац у выканкаме, і ўсе на кіруючых пасадах, працаваў начальнікам аддзелу моладзі, потым – спорту і турызму, потым – спартыўнага комплексу, зноў вярнуўся ў райвыканкам, а таксама з'яўляецца памочнікам дэпутата Палаты прадстаўнікоў Сяргея Канопліча). Але гераічная біяграфія не пазначана ў паведамленні пра стварэнне камісіі, Каробкін вылучаны «грамадзянамі». А яго калега, таксама дэпутат райсавету Тамара Брэль, дырэктар фабрыкі «Надэкс», вылучана ў камісію працоўным калектывам бухгалтэрыі роднага прадпрыемства.


Запісаны ў камісію і члены райвыканкаму Вераніка Байкова, Ларыса Чорная, Міхаіл Пашынскі. Яны аддана працавалі ў раённнай камісіі на мінулых прэзідэнцкіх выбарах, таксама, як і Мікалай Дзягцераў (кіруючы аддзяленнем банка «БПС-Сбербанк» у Мазыры), як і Наталля Усікава (дырэктар гасцінічнага комплексу «Прыпяць»). І Дзягцераў, і Усікава вылучаны ў камісію «ад грамадзян».

Канечне, прысутнічаюць у камісіі верныя яе сябры з мінулых выбараў Вераніка Байкова (начальнік арганізацыйна-кадравага аддзелу райвыканкаму), якую вылучылі таксама «грамадзяне», і Міхаіл Пашынскі (кіруючы справамі райвыканкама), вылучаны «прафсаюзам».

Начальнік мясцовага РУЭС (раённага вузла электрычнай сувязі) Аляксандр Болсун трапіў у камісію як вылучэнец ад роднага працоўнага калектыву.

Яшчэ адзін сябар раённай камісіі, Пётр Зыкун, да нядаўняга часу працаваў начальнікам РАУС, а зараз узначальвае паліграфічнае прадпрыемства «Калор», на якім друкуе сваю газету яшчэ адзін сябар камісіі – галоўны рэдактар раённай газеты «Жыццё Палесся» Ларыса Чорная. Апошняя трапіла ў камісію чамусьці ад прафсаюзу працаўнікоў аграпрамысловага комплексу. Ларыса Чорная і на Усебеларускі сход ездзіла ў 2010 годзе, пасля якога ў адным сваім артыкуле 25 разоў узгадала прозвішча прэзідэнта, запэўніваючы яго праз газету ў гарачай падтрымцы на выбарах-2010.

Дзяржаўныя служачыя павінны займаць не больш траціны камісіі, але наўрад ці гэты прынцып выконваецца ў Мазырскай раённай камісіі, прынамсі, як і ў іншых. Вось



яшчэ адзін сябар камісіі – начальнік міжраённай інспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету Уладзімір Лагімахаў.

Аднаго банкіра было мала ў камісіі, таму ўключылі сюды і Рыту Сцяпанчанку, кіраўніка аддзялення ў Мазыры «Белзнешэканомбанка». Канечне, у спісе пазначана, што вылучана яна ад «Беларускага саюза жанчын». Кіраўнік аддзялення банка ездзіла таксама на Усебеларускі сход у 2010 годзе, як і Наталля Усікава (дырэктар гасцінічнага комплексу «Прыпяць»), прынамсі, як і Ларыса Чорная. Рэдактар раёнкі так ужо **хваліла ў адным артыкуле** банкіра Рыту Сцяпанчанка.

Карацей, усе свае людзі ў камісіі, якія прадстаўляюць міфічную грамадскасць.

http://gomelspring.org/be/news/3061

Мазыр: начальнікі ідуць у дэпутаты праз збор подпісаў

Мазырская раённая камісія па выбарах дэпутатаў зарэгістравала 46 ініцыятыўных груп па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты раённага Савет. Рэгістрацыйныя пасведчанні сябрам ініцыятыўных груп і падпісныя лісты выдаваліся адразу пасля падачы неабходных дакументаў у раённую выбарчую камісію. Як паведамляе назіральнік Уладзімір Целяпун, паседжанне Мазырскай выбарчай камісіі прайшло 17 студзеня, былі зарэгістраваны ўсе ініцыятыўныя групы і прайшло ўзгадненне выбарчых участкаў і іх межаў.

У Мазыры утворана 41 выбарчая акруга.

«Адметнасцю гэтай выбарчай кампаніі можна лічыць падачу дакументаў па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты праз утварэнне ініцыятыўных груп усяго дырэктарскага корпусу, які «выбіраецца-прызначаецца» пазней у склад мясцовага Савета дэпутатаў. У выніку атрымліваецца, што

Працяг на стр. 2

Мазыр: на паседжанне па фарміраванні раённай выбарчай камісіі праваабаронцу не пусцілі



26 снежня адбылося сумеснае паседжанне Мазырскага райвыканкаму і райсавету дэпутатаў па фарміраванні раённай выбарчай камісіі. «Беларускі Хельсінскі Камітэт» загадзя накіраваў у райвыканкам заяву з просьбай дапусціць на паседжанне назіральніка БХК **Уладзіміра Целяпуна.** «Але як толькі я сёння зайшоў у выканкам, каб трапіць на паседжанне і толькі распрануў паліто, як прыйшла начальнік аддзелу арганізацыйна-кадравай працы райвыканкаму Вераніка Байкова і ўручыла мне ліст, дзе было напісана ад імя Мазырскага райсавету дэпутатаў, што на паседжанні мне прысутнічаць нельга», - паведаміў Уладзімір Целяпун.

У лісце было напісана, што «згодна артыкулу 34 Выбарчага кодэксу, прысутнічаць на сумесным паседжанні па фарміраванні раённай выбарчай камісіі маюць права прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад раённых выбарчых камісій». «БХК не вылучаў сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі, таму Вы не маеце права прысутнічаць на паседжанні», - прыйшлі ўлады да высновы.

«Стварэнне выбарчых камісій заўсёды чамусьці з'яўляюцца таямніцай органаў, якія іх утвараюць. Былі выпадкі ў 2006 і 2010 годзе, калі раённыя выбарчыя камісіі ствараліся нават да пачатку працоўнага дня райвыканкама. Мне ўдалося прысутнічаць на паседжаннях акруговых і ўчастковых камісій у 2010 годзе (мясцовых і прэзідэнцкіх выбарах). Гэтыя шматлікія камісіі былі ўтвораны за 15-20 хвілін. На паседжанні не ідзе абмеркавання і матывы адмовы неўключэння ў члены камісіі. Зачытваецца інфармацыя падрыхтаваная нейкай «працоўнай групай». Кім і на якой падставе ствараюцца гэтыя групы, якія іх паўнамоцтвы – невядома», - пракаментаваў праваабаронца.

Ён нагадаў, што артыкул 13 Выбарчага кодэксу гарантуе адкрытасць і галоснасць выбарчага працэсу, а артыкул 34 накладвае пэўныя абмежаванні.
http://spring96.org/be/news/68108

Працяг...

толькі пяць ініцыятыўных груп зарэгістраваныя ад іншых, незалежных ад уладаў, грамадзян. Аднак колькасць патэнцыйных кандыдатаў, магчыма, будзе павялічана праз вылучэнне ад партый і працоўных калектываў», - патлумачыў назіральнік.

Па яго словах, у надрукаваным на сайце спісе выбарчых участкаў адсутнічае колькасць выбаршчыкаў, што раней друкавалася. Уся колькасць выбарчых участкаў (81) належаць да выбарчых акруг па выбарах у Мазырскі райсавет, Гомельскі аблсавет і пасялковыя Саветы. Якія канкрэтна ўчасткі належаць да выбарчых акруг - асобна ў канкрэтны Савет, магчыма, выбаршчыкі і кандыдаты будуць высвятляць самі.

"Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Законным шляхам патрабаваць выканання правоў і свабодаў, гарантаваных Канстытуцыяй, немагчыма

Праваабаронца з Мазыра **Уладзімір Целяпун** атрымаў адказ на свой зварот ад старшыні Гомельскага абласнога суду **Сяргея Шаўцова.** У снежні 2013 года старшыня судовай інстанцыі праводзіў прыём грамадзян у Мазыры, і мясцовы праваабаронца задаў яму некалькі важных пытанняў.

Напрыклад, ці дзейнічаюць міжнародныя і канстытуцыйныя нормы ў беларускіх судах, і ў, прыватнасці, судах Гомельскай вобласці? Гэта пытанне ўзнікла з сітуацыі, калі ў 2011-2012 гадах Уладзімір Целяпун спрабаваў правесці ў Мазыры пікет, які забаранілі ўлады, а затым праз інстанцыі судовай сістэмы дабіцца рэалізацыі правоў, гарантаваных Канстытуцыяй.

Суды ж не далі ацэнку дзеянням Мазырскага РАУС, Цэнтральнай гарадской бальніцы, які адмаўляюць ў заключэнні дамоў, прадугледжаных законам «Аб масавых мерапрыемствах» і такім жа рашэннем райвыканкама. Сяргей Шаўцоў для дакладнага адказу на гэтае пытанне прасіў даслаць яму пастановы, рашэнні судоў па канкрэтных справах, што і зрабіў праваабаронца.

У адказе, атрыманым 15 студзеня, па сутнасці напісана, што суды дзейнічалі правамоцна. А наконт міжнародных дамоў, Канстытуцыі і закона аб масавых мерапрыемствах старшыня абласнога суду адказаў так, што наўрад ці без лінгвіста можна разабрацца, што менавіта меў на ўвазе Сяргей Шаўцоў. «Такім чынам, пры ДАЗВОЛЕ калізій паміж нормамі падканстытуцыйнага нацыянальнага заканадаўства і нормамі ЗНЯВОЛЕНЫХ міжнародных дагавораў трэба ўлічваць узровень нарматыўнага прававога акта, якім ВЫКАЗАНЫ ЗГОДУ Рэспубліке Беларусь на АБАВЯЗКОВАСЦЬ для яе адпаведнага міжнароднага дагавора», - так адказаў дакладна і літаральна старшыня суду, які «зняволіў» міжнародныя дамовы.

Яшчэ ў тэксце кідаюцца ў вочы такія выразы, як «уладаюць большай юрыдычнай сілай», «трэба вылучаць прынцыпы міжнароднага права ад норм міжнародных дагавораў» і так далей. «З адказаў, рашэнняў і пастановаў папярэдніх судоў вынікае, што агульным судам не падведамны праверкі законнасці прыняцця рашэнняў мясцовых уладаў, парадак рэалізацыі гэтых рашэнняў

Працяг...

адпаведнымі структурамі (РАУС, паліклініка, ЖКГ). Агульныя суды ніякім бокам у сваіх рашэннях не закранали невыкананне ратыфікаваных РБ міжнародных дамоваў. Вярхоўны Суд увогуле рэкамендаваў Гомельскаму абласному суду справу спыніць і мне адмовіць ў скарзе, што значыць - адмовіць мне законным шляхам патрабаваць выканання правоў і свабодаў, гарантаваных Канстытуцыяй», - пракаментаваў Уладзімір Целяпун.

Па яго словах, з адказу вынікае, што старшыня абласнога суду аспрэчвае прызнанне РБ прыярытэту агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права. «Асноўны закон РБ з'яўляецца пустой дэкларацыяй правоў і свабодаў як для грамадзян Беларусі, так і міжнароднай супольнасці», - прыйшоў да высновы праваабаронца.

http://gomelspring.org/be/news/3083

Меркаванне

"Ня бойцеся!"

Ян Павел||

Не трэба баяцца. Трэба ісці і змагацца за сваю годнасць, бо мы і ёсць тут сапраўдныя гаспадары. Я цалкам згодны з той думкай, што выбараў у нашай краіне не існуе, ёсць толькі імітацыя іх і фактычна прызначэнне "лаяльных" асоб. Але, на маю думку, змагацца на мясцовым узроўні — можна. Трэба вылучаць сапраўдных завадатараў, актывістаў, паспяховых бізнесменаў і проста неабыякавых людзей. Вылучайцеся самі, гаварыце з людзьмі, сустракайцеся, тлумачце!

І яшчэ. Вы ўсе добра ведаеце тых, хто ўваходзіць у склад выбарчых камісій. Яны жывуць у адным даму з вамі, у адным пад'ездзе з вамі, вось і паглядзіце ім у вочы! Задайце ім свае пытанні! Засцеражыце іх ад граху! Зрабіце ўсё, каб гэтыя людзі вельмі відавочна адчувалі сваю адказнасць. Няхай вашы дзеянні прымусяць задумацца "махляроў" ад улады. Бо ўлада далёка, а ім жыць побач з вамі.

Мае землякі! Не чакайце вы ад неба дажджу, змагайцеся, бярыце сваё. Не чакайце, што нехта прыйдзе — і ваша жыццё адразу палепшыцца. Ніхто не зменіць наша жыццё за нас.

Что писали о выборах депутатов в местные Советы в 2010 году

Депутаты местных советов в Беларуси работают бесплатно

Ольга ШЕСТАКОВА, Комсомольская правда в Белоруссии

25 апреля в Беларуси будут выбирать депутатов местных советов. В сельские, районные, областные советы депутатов мы выбираем аж 21 300 работников политического труда! Что за люди идут в местные советы? Какие законы они принимают? Какие проблемы избирателей и за какие деньги решают?

В депутаты идут из-за амбиций и ради статуса

Депутат местных советов - это гражданин Беларуси старше 18 лет. Местным депутатом в нашей стране может стать даже россиянин с видом на жительство. А вот белорусы, кстати, в России избираться не могут, там все депутаты работают за деньги, считаются чиновниками, а потому обязаны иметь гражданство.

Чаще всего депутат живет в той местности, где избирается. Ведь решать он будет вопросы не государственного, а местного уровня. И в интересах избирателей, чтобы он знал их проблемы, а еще лучше - разделял их. Например, ему тоже некуда поставить машину, он живет в старой многоэтажке без ремонта и против вырубки во-он той рощи.

Депутату местного совета в Беларуси зарплата не полагается. Они занимаются вопросами избирателей в свободное от основной работы или учебы время.

Когда депутата избирают, он получает удостоверение и нагрудный значок. Потом избранники из одной местности создают совет депутатов. Сессия - раз в квартал. Собираются они в любом удобном большом зале, примерно полдня.

- На сессию с работы отпускают. Какие еще преимущества? Уволить не могут, или из университета исключить, без согласия всего совета. В общем, социальные гарантии - примерно как у женщины в декретном отпуске! - шутит Ольга Харламова, депутат Свислочского поселкового Совета и молодая мама.

Зачем люди идут в депутаты? Во-первых, всегда есть товарищи, которым не сидится на месте, в декрете или на пенсии. Во-вторых, шанс изменить жизнь окружающих к лучшему. В-третьих, в стране есть люди, которым хочется заниматься политикой. А депутат местного совета - это первый уровень местной власти.

Впрочем, желающих не так уж много. И это беспокоит белорусский ЦИК:

- К сожалению, люди с каждым годом становятся более корыстолюбивыми. И только материальная, карьерная, статусная заинтересованность подвигает их на борьбу, а вовсе не желание служить родине, - заметила в интервью белорусскому радио глава Центризбиркома Лидия Ермошина.

Ручка и бумага - главное оружие народного избранника

Депутат сообщает местным властям, чего хотят жители поселка, района, области. Например, объясняет, что люди хотят в первую очередь отремонтировать не дорогу, а детсад. Минимум раз в месяц депутат должен встречаться с избирателями, получать от них "наказы", выслушивать жалобы, просьбы и проблемы, а потом реагировать на них. Депутат может помочь с обращениями к местным властям. На него вам и депутату должны дать ответ в 10-дневный срок. Еще есть "запрос депутата" - более серьезный документ, его должен одобрить весь совет. И, наконец, "предложение по устранению нарушений законности". Например, людям не выплатили зарплату или незаконно уволили. Если депутат считает, что закон откровенно нарушен, он может сразу писать в прокуратуру, милицию, Комитет госконтроля или профильное министерство - например, труда и соцзащиты.

- У депутата больше возможностей, потому что на его запрос должны обязательно отреагировать. И если гражданам отвечают в 30-дневный срок, то депутатам - максимум через 10 дней, - говорит Дмитрий Кухлей, депутат Мостовского районного Совета депутатов.

Возможности депутата зависят от уровня совета, по нарастающей:

Працяг са стар. 3

сельский (поселковый), районный и областной. Есть городские, но они часто объединены с районными.

- У меня 550 избирателей. От их имени я могу решать те проблемы, о которых они рассказывают, - говорит Ольга Харламова. - Занимаюсь в основном проблемами ЖКХ. Например, наше достижение - утепление нескольких квартир.

При этом доступа к бюджету у депутатов нет.

- Мы можем только предлагать, на что потратить бюджет, - говорит Ольга.

Более серьезные предложения требуют и большего времени. Например, на то, чтобы построить автостоянку или отремонтировать детсад, уходят месяцы депутатских писем, жалоб и запросов.

- В нашем районе в основном поступают жалобы на ЖКХ. Хотя наши коммунальники всегда отвечают, реагируют и стараются решить проблему, - рассказывает Дмитрий Кухлей. - Еще люди жаловались на плохой асфальт, маленькую пешеходную зону. Из достижений, пожалуй, можно назвать построенную автостоянку.

У областного совета, к которому приравнен и Минский горсовет, больше полномочий. Он рассматривает вопросы местных налогов, занимается контролем наружной рекламы. Еще благодаря минским депутатам в столице появился парк Тивали рядом с улицей Притыцкого, Татарский сквер за ЦУМом, улицы Налибокская, Люцинская и т.д. А вот предложения Мингорсовета запретить детям гулять после 23.00, а водку продавать только до 22.00, не одобрил Минюст. Оказалось, у Горсовета нет полномочий для таких решений.

Что еще решает местный депутат?

- Принимает план социально-экономического развития, бюджет и вносит свои предложения.

- Утверждает местные налоги и сборы. Может, например, предложить налоговые льготы.

- Утверждает порядок распоряжения коммунальной собственностью.

- Может назначать местные референдумы. Правда, в Беларуси пока ни одного не было.

- Слушает отчет исполкома о проделанной работе и планах на будущее, чтобы быть в курсе и рассказать избирателям. В идеале он должен услышать от них замечания и предложения и "соединить" граждан и местную власть.

- В комиссию, которая принимает дома к отопительному сезону, входит депутат.

- Называют новые улицы, скверы, парки. Могут предложить переименовать старые.

- Представлять человека в суде может адвокат и депутат.

- Когда сдается дом перед отопительным сезоном, в комиссию по их приему входит депутат.

Стоит знать, с чем не нужно идти к депутату. Он не занимается личными вопросами граждан - семейными разборками и скандалами. Он не юрист и не может консультировать по квартирным вопросам, не может выбить жилье или помочь получить-продать-купить квартиру.

Наивные вопросы о выборах-2010

Кто выбирает?

Граждане Беларуси, которые живут на избирательном участке, плюс - граждане России с видом на жительство. По данным МВД за прошлый год, в Беларуси живет около 80 тысяч россиян.

Что изменилось для избирателя по новому закону?

Главное - отменили нижний порог явки на местных выборах. Раньше, чтобы выборы состоялись, нужно было, чтобы проголосовало больше 50% живущих в местности. Сейчас такого ограничения нет. Кто придет, тот и выберет депутата!

Будут ли агитировать?

С 14 февраля начнут собирать подписи, ставить пикеты. На агитацию кандидату в депутаты сельсовета полагается 1 базовая величина (35 тысяч рублей), областного совета или Минского горсовета - 8 базовых (280 тысяч). Собственные средства использовать нельзя. Время для выступления на радио и помещения для встреч с избирателями будут предоставляться кандидатам бесплатно.

В 2014 году добавилось - запрет на агитацию байкота выборов и изготовление агитационной прадукции за счет средств из фонда, собраных кандидатом.

Не надо бояться выбирать новых людей

Только через свободные, честные выборы могут появиться новые люди, которые способны что-то изменить в лучшую сторону, повести массы за собой. Но этих людей еще на стадии регистрации под любыми предлогами отсекают, поэтому мы их и не видим. И создается впечатление, что их вообще нет.

Не надо бояться выбирать новых людей. И пусть Вам сразу покажется, что они не занимают высоких должностей, не имеют высшего образования. Но ведь это и не дает оснований считать, что эти люди ничего не смогут сделать или добиться. Это только зависит от человека, а вовсе не от образования. У нас в «Палатке» исключительно образованные люди, а посмотрите, что они творят, как «защищают» Ваши интересы. В Советское время большинство депутатов были рабочими и колхозниками и ,вспомните, сколько Вы имели льгот. А нынешние депутаты все эти льготы у Вас поотбирали да еще обложили огромными налогами. Вы этого хотите?

— Главное понять: за судьбу страны отвечают не политики (во власти или в оппозиции), а сами граждане. Если каждый человек начнет с себя, сделает какое-то доброе дело, пусть самое маленькое — польза от этого будет не только для кого-то конкретно, но и для всей страны в целом.

Большинство граждан страны должны прийти к пониманию того, что, не решив проблему честных и справедливых выборов, мы не решим ни одну из проблем, с которыми сталкиваемся в повседневной жизни. В этих условиях каждый мыслящий человек, каждый кандидат и каждый избиратель должны ответить себе на вопрос: **участвовать в предлагаемом действии или нет? И если «ДА», то на чьей стороне?**

Мазырскія **НАВІНЫ**
ГРАМАДСКА-ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ВЫДАННЕ
Наклад 299 асобнікаў
Эл. адрас рэдакцыі: mazyrcivil@gmail.com